| первоначальная стоимость | 121 | | 14 |
| амортизация | 122 | | 6 |
| остаточная стоимость | 130 | - | 8 |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 6 | 34 |
| В том числе: | | | |
| незавершенное строительство | 141 | 1 | |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **9 686** | **11 437** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 4 559 | 5 295 |
| В том числе: | | | |
| сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | 399 | 400 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты | 213 | - | - |
| расходы на реализацию | 214 | 56 | 46 |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | 4 031 | 4 788 |
| товары отгруженные | 216 | - | 20 |
| выполненные этапы по незавершенным работам | 217 | - | |
| расходы будущих периодов | 218 | 73 | 41 |
| прочие запасы и затраты | 219 | - | - |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | 886 | 302 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | - | - |
| В том числе: | | | |
| покупателей и заказчиков | 231 | - | - |
| прочая дебиторская задолженность | 232 | - | - |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 1 743 | 3 084 |
| В том числе: | | | |
| покупателей и заказчиков | 241 | 1 207 | 1 647 |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | 474 | 1 291 |
| по налогам и сборам | 243 | 32 | 72 |
| по расчетам с персоналом | 244 | 28 | 67 |
| разных дебиторов | 245 | 2 | 7 |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | - | - |
| Расчеты с учредителями | 250 | - | - |
| В том числе: | | | |
| по вкладам в уставный фонд | 251 | - | - |
| прочие | 252 | - | - |
| Денежные средства | 260 | 407 | 718 |
| В том числе: | | | |
| денежные средства на депозитных счетах | 261 | - | - |
| Финансовые вложения | 270 | 25 | 25 |
| Прочие оборотные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **7 620** | **9 424** |
| **БАЛАНС (190 + 290)** | **300** | **17 306** | **20 861** |

| Пассив | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 301 | 301 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | - | - |
| Резервный фонд | 420 | 47 | 47 |
| В том числе: | | | |
| резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | 47 | 47 |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | - | - |
| Добавочный фонд | 430 | 9 801 | 11 659 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | - | |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | 3 497 | 5 872 |
| Целевое финансирование | 460 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 470 | 6 | |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **13 652** | **17 879** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | **-** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 2 048 | 2 089 |
| Кредиторская задолженность | 620 | 1 590 | 877 |
| В том числе: | | | |
| перед поставщиками и подрядчиками | 621 | 172 | 169 |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | 201 | 427 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | 147 | 157 |
| по прочим расчетам с персоналом | 624 | | - |
| по налогам и сборам | 625 | 994 | |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 43 | 24 |
| по лизинговым платежам | 627 | - | - |
| перед прочими кредиторами | 628 | 33 | 100 |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | 16 | 16 |
| В том числе: | | | |
| по выплате доходов, дивидендов | 631 | 16 | 16 |
| прочая задолженность | 632 | - | - |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 650 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **3 654** | **2 982** |
| **БАЛАНС (490 + 590 + 690)** | **700** | **17 306** | **20 861** |
| Из строки 620: | | | |
| долгосрочная кредиторская задолженность | 701 | - | - |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | 1 590 | 877 |

| Активы и обязательства, учитываемые за балансом | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства | 001 | - | - |
| Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение | 002 | 13 | 13 |
| Материалы, принятые в переработку | 003 | - | - |
| Товары, принятые на комиссию | 004 | - | - |
| Оборудование, принятое для монтажа | 005 | - | - |
| Бланки строгой отчетности | 006 | 104 | 10 |
| Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов | 007 | - | 4 |
| Обеспечения обязательств и платежей полученные | 008 | - | |
| Обеспечения обязательств и платежей выданные | 009 | - | 576 |
| Амортизационный фонд воспроизводства основных средств | 010 | 13 | - |
| Основные средства, сданные в аренду (лизинг) | 011 | - | - |
| Нематериальные активы, полученные в пользование | 012 | - | - |
| Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов | 013 | - | - |
| Потеря стоимости основных средств | 014 | - | - |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
**с 1 января 2010 года по 31 декабря 2010 года**

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 62 543 | 38 050 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 9 819 | 5 402 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010 – 011) | 020 | 52 724 | 32 648 |
| Справочно: | | | |
| из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | - | - |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 44 530 | 28 742 |
| Валовая прибыль (020 – 021 – 030) | 040 | 8 194 | 3 906 |
| Управленческие расходы | 050 | - | - |
| Расходы на реализацию | 060 | 3 621 | 2 538 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020 – 030 – 050 – 060)** | **070** | **4 573** | **1 368** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 2 226 | 4 760 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | 309 | 312 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080 – 081) | 090 | 1 917 | 4 448 |
| В том числе: | | | |
| проценты к получению | 091 | - | - |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | - | - |
| доходы от операций с активами | 093 | 100 | 98 |
| прочие операционные доходы | 099 | 1 817 | 4 350 |
| Операционные расходы | 100 | 522 | 2 883 |
| В том числе: | | | |
| проценты к уплате | 101 | - | - |
| расходы от операций с активами | 102 | 63 | 88 |
| прочие операционные расходы | 109 | 459 | 2 795 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090 – 100)** | **120** | **1 395** | **1 565** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 826 | 639 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | 9 | 1 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130 – 131) | 140 | 817 | 638 |
| Внереализационные расходы | 150 | 1 843 | 1 611 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140 – 150)** | **160** | **-1 026** | **-973** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (± 070 ± 120 ± 160)** | **200** | **4 942** | **1 960** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | 847 | 1 076 |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | | 38 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (± 200 + 210 – 220)** | **240** | **5 789** | **2 998** |
| Налог на прибыль | 250 | 1 389 | 694 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 273 | 157 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | 3 | |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200 – 250 – 260 – 270)** | **300** | **3 277** | **1 109** |
| Справочно (из строки 300): | | | |
| сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 310 | - | |
| Прибыль (убыток) на акцию | 320 | - | - |
| Количество прибыльных организаций / сумма прибыли | 330 | 0/0 | 0/0 |
| Количество убыточных организаций / сумма убытка | 340 | 0/0 | 0/0 |

**Расшифровка отдельных внереализационных доходов и расходов**

| Показатель | | За отчетный период | | За аналогичный период предыдущего года | |
|---|---|---|---|---|---|
| наименование | код | доход | расход | доход | расход |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании | 350 | 6 | 66 | 1 | 5 |
| Прибыль (убыток) прошлых лет | 360 | 26 | 44 | - | - |
| Возмещение убытков, причиненных неисполнением или ненадлежащим исполнением обязательств | 370 | - | - | - | - |
| Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте | 380 | 691 | 749 | 107 | 199 |
| Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности | 390 | 2 | - | 1 | - |
| Прочие доходы и расходы | 400 | 92 | 984 | 529 | 1 407 |
| **ИТОГО** | **500** | **817** | **1 843** | **638** | **1 611** |

По мнению Аудиторского общества с ограниченной ответственностью «Силар», бухгалтерская отчетность СОАО «Минск-Лада», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение СОАО «Минск-Лада» на 1 января 2011 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2010г., при этом совершенные СОАО «Минск-Лада» финансовые (хозяйственные) операции во всех существенных отношениях соответствуют законодательству.

**Руководитель** **А.И. Стельмах**
**Зам. главного бухгалтера** **Е.М. Белова**

## ОАО «ТРИКОТАЖТОРГ»

220005, г. Минск, ул. Платонова, 30

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 года

(млн руб.)

| АКТИВ | Код строки | На начало отчетного периода | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства: | 110 | 3 557 | 3 691 |
| Нематериальные активы: | 120 | 1 | 1 |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 21 | 1 |
| **ИТОГО по разделу I** | 190 | **3 579** | **3 693** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 2 852 | 3 446 |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | 28 | 32 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 2 645 | 3 078 |
| Денежные средства | 260 | 361 | 993 |
| Финансовые вложения | 270 | 30 | 10 |
| **ИТОГО по разделу II** | 290 | **5 916** | **7 559** |
| **БАЛАНС** | 300 | **9 495** | **11 252** |

| ПАССИВ | Код строки | На начало отчетного периода | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 1 697 | 1 697 |
| Резервный фонд | 420 | 127 | 123 |
| Добавочный фонд | 430 | 1 796 | 1 913 |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | 2 556 | 2 675 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **6 176** | **6 408** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Кредиторская задолженность | 620 | 3 319 | 4 844 |
| **ИТОГО по разделу V** | 690 | **3 319** | **4 844** |
| **БАЛАНС** | 700 | **9 495** | **11 252** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января 2010 г. по 31 декабря 2010 г.

(млн руб.)

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный период | За аналог. период прошлого года |
|---|---|---|---|
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 32 872 | 26 877 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 4 494 | 3 598 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 23 922 | 19 476 |
| Валовая прибыль | 040 | 4 456 | 3 803 |
| Расходы на реализацию | 060 | 3 437 | 2 688 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг** | 070 | **1 019** | **1 115** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов | 120 | 102 | 42 |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов | 160 | -38 | 69 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **200** | **1 083** | **1 226** |
| Налог на прибыль | 250 | 249 | 284 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 76 | 80 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | 3 | - |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **300** | **755** | **862** |

**Количество акционеров, всего – 125, в том числе: юридических лиц – 1, физических лиц – 124.**

| Наименование показателя | Ед. измер. | За отчетный период | За аналог. период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов | млн руб. | 83,1 | 94,8 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 734 | 838 |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тыс. руб. | 56,6 | 54,6 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | - | - |
| Просроченная дебиторская задолженность | млн руб. | - | - |
| Просроченная кредиторская задолженность | млн руб. | - | - |

Среднесписочная численность работающих (человек) – 123.
Основные виды продукции или виды деятельности по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: **оптовая торговля товарами народного потребления, розничная торговля товарами народного потребления, операции с недвижимым имуществом.**

**Генеральный директор** **И.Э. Кобза**
**Главный бухгалтер** **Т.А. Полюхович** УНН 100185103.

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ОАО «ТОРГОВЫЙ ЦЕНТР «УРУЧЬЕ»

**на 01.01.2011 год.**

УНП 101081643, г.Минск, ул.Руссиянова, д.36, тел. 260-81-51, р/с 3012200745007 в ЗАО «Альфа-Банк», код 270. Адрес банка: г. Минск, ул. Мясникова, д. 70

| АКТИВ | Млн. руб | ПАССИВ | Млн. руб |
|---|---|---|---|
| **1. Внеоборотные активы** | **606** | **1. Капитал и резервы, в т.ч.** | **368** |
| **2. Оборотные активы, в т.ч.** | **1455** | - Уставный фонд | 112 |
| - Запасы и затраты | 942 | - Добавочный фонд | 52 |
| - Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 335 | - Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 4 |
| - Дебиторская задолженность | 51 | - Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 200 |
| - Денежные средства | 127 | **2. Долгосрочные обязательства** | **0** |
| - Финансовые вложения | - | **3. Краткосрочные обязательства, в т.ч.** | **1 693** |
| - Прочие оборотные активы | - | - Кредиторская задолженность | 1 693 |
| **БАЛАНС** | **2061** | **БАЛАНС** | **2 061** |

### ОТЧЕТ

ОАО «Торговый центр «Уручье» о прибылях и убытках за 2010 год

| Наименование показателей | Млн. руб. |
|---|---|
| **Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг** | **353** |
| **Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов** | **11** |
| **Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов** | **- 240** |
| **Прибыль (убыток)** | **124** |
| **Прибыль (убыток) до налогообложения** | **457** |
| **Налог на прибыль** | **110** |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 10 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | - |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **4** |

Информация об ОАО «Торговый центр «Уручье» и его деятельности

1. **Количество акционеров** ОАО «Торговый центр «Уручье»: всего — 9, в том числе юридических лиц - 5 и физических лиц - 4
2. **Информация о дивидендах и акциях за 2010 год**:

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период |
|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн. рублей | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | - |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тыс. рублей | 571 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | - |

3. **Информация о задолженности:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период |
|---|---|---|
| Просроченная дебиторская задолженность | Млн. рублей | нет |
| Просроченная кредиторская задолженность | Млн. рублей | нет |

4. **Среднесписочная численность** работающих (человек) – 139.
5. **Основные виды продукции или виды деятельности**, по которым получено двадцать и более процентов выручки – розничная торговля (включая алкогольные напитки и табачные изделия) и общественное питание.

**Директор ОАО «Торговый центр «Уручье»** **Ю.В. Воевода**
**Главный бухгалтер** **А.С. Стрелковская**

У **суд Ельскага раёна Гомельскай вобл.** паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **Суханіцкага Аляксея Анатольевіча** 5 снежня 1976 года нараджэння, ураджэнца г. Ельск Гомельскай вобл. З 9 снежня 2006 г. знаходзіцца ў вышуку за ўчыненне злачынства. Апошняе месца жыхарства: г. Ельск, вул. 50 гадоў СССР, д. 36, кв. 47. У 2006 г. Суханіцкі А.А. з'ехаў у РФ і да гэтага часу месца яго знаходжання невядома.

Просім грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Суханіцкага Аляксея Анатольевіча, паведаміць суду Ельскага раёна на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

# ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 2 (2)



# ПАВЕТРАНАЯ ВАРТА

**8 лістапада 2001 года Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зацверджана рашэнне аб стварэнні адзінага віду Узброеных Сіл — Ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны. Адна з галоўных задач гэтых войскаў — нясенне баявога дзяжурства па ахове паветраных рубяжоў Беларусі. Штодзень на баявое дзяжурства заступае больш за тысячу чалавек, у ім задзейнічаны шэраг камандных пунктаў, зенітных ракетных дывізіёнаў, экіпажаў самалётаў і верталётаў, часцей і падраздзяленняў радыётэхнічных войскаў. Неба Беларусі — пад надзейнай аховай.**

## МАРА САЛДАТА

Калі і не кожны прызыўнік хоча патрапіць служыць у войскі проціпаветранай абароны, дык, ва ўсялякім разе, сваякі тых, хто адслужыў у зенітных ракетных дывізіёнах, мараць менавіта пра такую службу. Ахова паветраных рубяжоў, праца са складанай тэхнікай, магчымасць выехаць на стрэльбы за межы Беларусі — далёка не ўсе перавагі такой службы.

На працягу ўсёй гісторыі зенітных ракетных войскаў сюды адбіралі служыць найбольш інтэлектуальна падрыхтаваных людзей. Зенітныя ракетныя комплексы дастаткова складаныя ў эксплуатацыі, і без пэўных ведаў тут не абысціся: напрыклад, салдату неабходна разбірацца ў радыёэлектроніцы. Акрамя таго, чалавек, які будзе адказваць за ахову неба, павінен валодаць і адпаведнымі валявымі якасцямі.

— Проціпаветраны бой хуткацечны. Але гэтаму могуць папярэднічаць пэўныя дзеянні праціўніка — ён на ражон не палезе, а будзе разведваць, здзяйсняць нейкія дэманстратыўныя дзеянні, чакаць, калі той, хто за ім сочыць, стоміцца ад пастаяннай напругі. Каб вытрымаць такую «гульню», валявыя характарыстыкі павінны быць развіты і ў афіцэраў, і ў салдат. Гэтак жа, як і логіка — каб умець прадугадаць хады праціўніка і супрацьпаставіць яму нешта сваё. Калі сачыць за ваеннымі канфліктамі, што адбываюцца ў свеце, можна заўважыць, што праціўнік пастаянна прымае новыя тэхнічныя прыёмы, якія ад канфлікту да канфлікту не паўтараюцца, — заўважае **начальнік зенітных ракетных войскаў Ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны Ігар БЫСТРЫ**.

Якія якасці цэняцца ў салдатах, што служаць у такіх войсках, мы высвятлялі ў 15-й зенітнай ракетнай брыгадзе, што размяшчаецца недалёка ад Мінска.

— Чалавек павінен быць адказным, умець працаваць самастойна, а не чакаць, каб хтосьці над ім стаяў і аддаваў каманды, — упэўнены **намеснік камандзіра дывізіёна па ідэалагічнай працы 15-й зенітнай ракетнай брыгады Андрэй ГАМОЛКА**.

***— Магчыма, служба ў зенітных ракетных войсках падыходзіць тым людзям, якія кажуць, што яны супраць таго, каб трымаць зброю у руках: усё ж тут трэба страляць у праціўніка, якога не бачыш у твар?*** — цікавімся мы.

— Гэта як паглядзець, — разважае Андрэй Вячаслававіч.— Ёсць такое паняцце «ахова абароны». Частка людзей павінна быць задзейнічана ў ахове часці, каб ніякія дыверсанты не праніклі сюды і не вывелі тэхніку са строю. Таму ў кожнага салдата і афіцэра ёсць табельная зброя, два разы на тыдзень ідуць заняткі па агнявой падрыхтоўцы, і штомесяц — стрэльбы. Так што ў дадатак да таго, што салдаты спасцігаюць, як працаваць са складанай тэхнікай, вывучаюць авіяцыю, якая зараз ёсць на ваенных аэрадромах свету, яны набываюць навыкі і звычайнага пехацінца.

Дарэчы, дэсант «Звязды» невыпадкова высадзіўся ў 15-й зенітнай ракетнай брыгадзе. На яе ўскладзена вялікая адказнасць — ахоўваць паветраныя рубяжы сэрца Беларусі — горада Мінска. Тут плануецца стварыць узорны гарадок войскаў супрацьпаветранай абароны.

Сёння гэта не толькі адна з самых баяздольных (вайскоўцы на працягу 15 гадоў выязджаюць на баявыя стрэльбы на расійскія палігоны) воінскіх часцей, але і з самых прыгожых, і, можна нават сказаць, утульных для службы. Тут вялікая ўвага ўдзяляецца быту вайскоўцаў. Напрыклад, у казарме абсталяваны трэнажорамі спартыўны куток, ёсць душавая, стаіць пральная машына.

Вывучаем меню ў сталоўцы і бачым, што мясныя стравы тут выдаюцца два разы на дзень, а на вячэру гатуецца рыба.

Даведваемся і пра баявое жыццё часці. Два разы на дзень тут праходзіць так званы кантроль функцыянавання, прыцягваецца баявы разлік, уключаецца тэхніка. Некалькі разоў на месяц войскі проціпаветранай абароны адпрацоўваюць баявыя задачы сумесна з авіяцыяй. Задача выкрыць цэль, суправадзіць і зымітаваць паражэнне... Але самае цікавае ў службе часці — выезд на баявыя стрэльбы на расійскія палігоны.

Навучанне праходзіць непасрэдна на той тэхніцы, на якой у выпадку неабходнасці салдатам давядзецца ваяваць. Нам паказваюць ЗРК С-300, такія комплексы стаяць сёння на ўзбраенні Расійскай Федэрацыі, і гэта адзін з самых эфектыўных сродкаў проціпаветранай абароны.

Акрамя таго, падрыхтаваныя вайскоўцы нясуць баявое дзяжурства па ахове паветраных рубяжоў Мінска.

І як запэўніваюць у часці, ніводзін самалёт, што патрапіць у паветра Беларусі, не застанецца незаўважаным. Тут нават вядома пра тое, якія самалёты ўзлятаюць з аэрадромаў у Польшчы і Літве.

Дык можа, людзі, якія сочаць за небам, могуць нам даць кампетэнтны адказ пра тое, ці існуе насамрэч... НЛА? На наша пытанне вайскоўцы рэагуюць з усмешкай. Ва ўсялякім разе пакуль якая лятальная талерка не з'явіцца, напрыклад, на плошчы Незалежнасці ў Мінску, яны ў гэта не павераць. Жарты жартамі, але трэба адзначыць, што менавіта ад гэтага роду войскаў шмат у чым залежыць бяспека краіны.

## ВОЙСКІ, ШТО НЕ СТРАЛЯЮЦЬ, — «НЕЖЫВЫЯ»

У гэтым упэўнены начальнік зенітных ракетных войскаў Ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны Ігар Быстры, бо ў сучасных ваенных канфліктах, як правіла, усё вырашаецца ў паветры, а наземнай фазы бою можа і не быць.

***— Ігар Аляксандравіч, на якія старонкі ў гісторыі зенітных ракетных войскаў варта звярнуць увагу?***

— Калі браць гісторыю зенітных ракетных войскаў незалежнай Беларусі, ключавым момантам можна назваць 1996 год, калі войскі ўпершыню паехалі выконваць баявыя стрэльбы на палігоны Расійскай Федэрацыі. Калі зенітныя ракетныя войскі не праводзяць стрэльбы з баявымі пускамі, яны «нежывыя». З 1996 года нашы злучэнні, воінскія часці штогод выязджаюць на палігоны Расійскай Федэрацыі, мы правялі ўжо 256 баявых стрэльбаў. Штогод амаль 50 працэнтаў воінскіх часцей зенітных ракетных войскаў прымае ўдзел у баявых стрэльбах на палігонах Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь. І трэба адзначыць, што мы ніколі не вярталіся з дрэннымі вынікамі з палігона. У 2005 годзе мы атрымалі ў Расіі 4 зенітныя ракетныя комплексы С-300, праводзім капітальныя рамонты ЗРК на расійскіх і беларускіх прадпрыемствах. Комплексы вывозім на палігоны і праводзім на іх баявыя стрэльбы, як гэта было прынята пры Савецкім Саюзе. Не будуць страляць зенітныя ракетныя войскі — усё заржавее. Гэта як і са звычайнай машынай, калі на ёй не ездзіць, яна папросту перастане працаваць.

***— У часы развалу Савецкага Саюза, калі армія перажывала скарачэнні, менавіта войскі проціпаветранай абароны пацярпелі менш за іншых...***

— Зенітныя ракетныя войскі — асноўная агнявая сіла. Войскі проціпаветранай абароны, і ў прыватнасці зенітныя ракетныя, пры развале Савецкага Саюза захавалі сваю структуру практычна нязменнай. Ніводзін праціўнік не пойдзе наперад, пакуль не вырашыць задачу ў паветры. Калі знішчана сістэма проціпаветранай абароны альбо калі яна не дзейнічае, можна спакойна, беспакарана лятаць над краінай, рабіць усё, што заўгодна, наносіць удары па войсках. І падзеі ў Лівіі — сведчанне таму. Мы ўсё сочым за Лівіяй і чакаем, калі яна дасць адпор. Гэтак жа, як глядзелі на падзеі ў Югаславіі, Іраку і ўсё чакалі, якім будзе адпор. Але, відаць, там няма для гэтага сродкаў, а мы падобныя сродкі і сілы маем. На адпаведным узроўні мы захавалі тэхніку. Сёння капітальны рамонт ЗРК праводзіцца ўжо і на прадпрыемствах Беларусі. Мы іх мадэрнізуем, паляпшаем тактыка-тэхнічныя характарыстыкі. Набываем новыя ўзоры ўзбраення ваеннай тэхнікі. Мы не стаім на месцы, у гэтым накірунку працуе і наша прамысловасць, і наша навука. Бо разумеем: калі ўпусціць час — пасля наганяць будзе вельмі цяжка.

***— Атрымліваецца, што, назіраючы за баявымі канфліктамі ў свеце, вы пралічваеце, як можна дзейнічаць у падобнай сітуацыі?***

— Усе ваенныя канфлікты мы ўважліва вывучаем, назіраем за дзеяннямі праціўніка. Дарэчы, увесь час тактыка мяняецца, праціўнік не паўтараецца. На кожнае дзеянне глядзім, якое можа быць супрацьдзеянне з нашага боку. Мы пастаянна трымаем войскі ў гатоўнасці па адбіванні агрэсіі. Так, зараз прайшла вялікая сумесная трэніроўка па ўсёй краіне з палётамі кантрольных цэляў, і зенітныя ракетныя войскі паказалі сябе вельмі добра. Ніводнай прапушчанай кантрольнай цэлі не было. Мы адпрацоўваем многа тактычных прыёмаў, шмат увагі надаём пытанням маршавай падрыхтоўкі, каб зенітныя ракетныя комплексы не стаялі на месцы, а здзяйснялі манеўры ў новыя пазіцыйныя раёны і працавалі з гэтых пазіцыйных раёнаў. У гэтым — забеспячэнне жывучасці войскаў, бо, калі комплекс стаіць на месцы, ён будзе знішчаны пасля выкрыцця разведчыкамі ў лічаныя гадзіны.

***— Беларусь адказвае ў тым ліку і за ахову паветраных рубяжоў Расіі...***

— Можна сказаць, што Беларусь — гэта фарпост паміж краінамі НАТА і Расійскай Федэрацыяй. І Расіі выгадна мець такога надзейнага саюзніка. Дарэчы, сярод ваенных ніякіх раздзяленняў няма. Ніколі мы ад афіцэраў Расійскай Федэрацыі ніякіх перашкод ні ў чым не мелі і заўсёды можам разлічваць на іх дапамогу. Мы добра ўзаемадзейнічаем, сябруем. На палігонах праводзім сумесныя вучэнні. Наступныя маштабныя вучэнні пройдуць на палігоне Ашулук у верасні. На вучэннях мы не спаборнічаем адно з адным. Мы радуемся і за беларусаў, і за рускіх, за тое, што ўсе мішэні збітыя ракетамі. Мы назіраем спосабы і прыёмы проціпаветранага бою, збіраемся разам і на навукова-практычных канферэнцыях. Мы вучымся ў іх, яны нешта глядзяць у нас. Напрыклад, у Беларусі моцна развіта аўтаматызацыя проціпаветранага бою. Комплексы сродкаў аўтаматызацыі ў мінулым годзе мы вывозілі на палігон, паказвалі расійскім калегам. І яны іх высока ацанілі. Баявыя разлікі Беларусі выязджаюць на вучэбна-трэніровачныя базы ў РФ, у Падмаскоўе. У бліжэйшы час плануецца такі ж вучэбна-трэніровачны цэнтр па падрыхтоўцы разлікаў ЗРК С-300 стварыць пад Мінскам.

Беларускія курсанты вучацца ў Смаленску і ў Яраслаўлі — у тым ліку і на новых тыпах комплексаў, якія ў перспектыве з'явяцца ў Рэспубліцы Беларусь. Падчас вучобы курсанты абзаводзяцца сябрамі. На палігонах даволі часта можна бачыць, як нашы і расійскія афіцэры вітаюць адзін аднаго, абдымаюць, дзеляцца навінамі. Армія — гэта адзін з прыкладаў збліжэння народаў.

*(Заканчэнне на 6-й стар.)*



## Родная мова ў беларускім войску

### Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ:

# «Можна, канешне, вярнуцца і да вайсковых камандаў Вялікага Княства Літоўскага — але... ці будуць яны зразумелыя сёння?»

**У эксклюзіўным інтэрв'ю «Звяздзе» (12.02.2011) міністр абароны Рэспублікі Беларусь Юрый Жадобін адзначыў, што ў роце ганаровай варты, якая па праве з'яўляецца візітнай карткай нашай краіны, усе каманды аддаюцца на беларускай мове; летась быў ажыццёўлены пераклад агульнавайсковых статутаў на беларускую мову.**



**Гэта, безумоўна, сведчыць аб сур'ёзным зруху ў бок пашырэння роднай мовы ў сферы ваеннай дзейнасці. Тым не менш, рэакцыя на гэты «вайскова-моўны крок» была рознай, часам нават рэзка-абуральнай...**

**Сённяшні суразмоўца «Плацдарма» — дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар філалагічных навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ.**

***— Менавіта акадэмічны Інстытут мовы і літаратуры па заказе Міністэрства абароны ажыццявіў пераклад агульнавайсковых статутаў. Аляксандр Аляксандравіч, на якія базавыя прынцыпы арыентаваліся навукоўцы, выконваючы гэтую працу?***

— Мы ўлічвалі, перш за ўсё, сучасны стан беларускай мовы, яе нормы, а таксама ўзровень моўнай кампетэнцыі сучаснага грамадства.

Былі перакладзены з рускай на беларускую мову чатыры асноўныя статуты з усімі неабходнымі дадаткамі да іх: Статут унутранай службы, Статут гарнізоннай і каравульнай службаў, Дысцыплінарны статут і Страявы статут.

***— Цікава, а як па-беларуску гучаць ці не самыя распаўсюджаныя каманды «Равняйсь!», Смирно!»?***

— Мы пераклалі як «Раўняйся!» і «Смірна!».

***— Некаторыя найбольш «прасунутыя» грамадзяне абрушыліся з рэзкай крытыкай...***

— Хачу падкрэсліць: можна гаварыць пра «прасунутых» — і можна гаварыць пра «няграматных». Але ў любым выпадку варта гаварыць пра літаратурную мову з пэўнымі нормамі і пра тэрміналогію, якая павінна быць абсалютна зразумелай і дакладнай. Вось і ўсё. Менавіта такім чынам трэба падыходзіць і да перакладу такіх спецыфічных тэкстаў, як статуты.

Прычым у дадзеным выпадку можна весці гаворку нават не столькі пра пераклад, колькі пра фарміраванне корпусу тэрміналагічнай лексікі, якая выкарыстоўваецца ў той ці іншай сферы дзейнасці. Мы гаворым пра ваенную сферу, і таму традыцыйна, па нейкай інерцыі (паколькі да нядаўняга часу гэта сфера была фактычна цалкам рускамоўнай) мы гаворым пра пераклад.

Яшчэ раз засяроджу ўвагу: тэксты воінскіх статутаў — гэта ў значнай ступені тэрміналогія, і тут павінен быць падыход як да навуковай тэрміналогіі. А ўсе тэрміны, у тым ліку каманды, павінны быць дакладнымі і зразумелымі — адназначна.

Наш пераклад некаторыя крытыкавалі, нават не бачыўшы яго.

Дапусцім, выказвалася крытыка адносна каманды «Паўабарота налева — паўабарота направа!». У адным з перакладаў 1990-х гг. прапаноўваўся, напрыклад, такі варыянт: «Лева-скос, права-скос!». Вось скажыце, калі ласка, хто з сучасных носьбітаў мовы, калі пачуе такую каманду, зразумее, што гэта азначае? Дык ці не лепш прыняць такія варыянты, якія будуць зразумелыя сучаснаму носьбіту мовы? Мы прытрымліваемся менавіта такой пазіцыі.

Вы спыталі пра каманды «Раўняйся!», «Смірна!» — нашы крытыкі прапануюць у якасці альтэрнатыўных варыянтаў наступныя: «Шыхтуйся!» і «Зважай!». Аднак наколькі яны зразумелыя сучаснаму чалавеку?.. Спецыфіка вайсковых статутаў у тым, каб дакладна, сэнсава адназначна перадаваць паняцці.

Так, можна ўлічваць усё, што было на розных этапах развіцця беларускай мовы, — што было 20 гадоў назад, 50 і нават 400. Але, паўтараю, калі мы хочам, каб мова развівалася паўнацэнна і ў гэтай сферы зносін, яна павінна адпавядаць свайму сучаснаму стану і быць зразумелай сучаснаму носьбіту.

Менавіта гэтым і трэба кіравацца. Інакш... Можна, канешне, вярнуцца і да вайсковых камандаў Вялікага Княства Літоўскага — але... ці будуць яны зразумелыя сёння?

***— Наколькі ведаю, у сярэдзіне 1990-х быў выдадзены слоўнік ваенных тэрмінаў...***

— Ён у значнай ступені адпавядае тым нормам, якія ўласцівыя сучаснай беларускай мове і, у прынцыпе, дазваляе выкарыстоўваць беларускую мову ў сферы ваеннай дзейнасці. Зразумела, мы ўлічвалі гэты слоўнік пры перакладзе воінскіх статутаў. Але ж, вы самі разумееце, любая справа мае як свае дадатныя бакі, так і пэўныя недахопы. Таму некаторыя моманты былі пададзены ў нашых перакладах інакш, у адпаведнасці з сучасным станам мовы.

Нельга не ўлічваць, што беларуская мова імкліва развіваецца, на мяжы XX і XXI стагоддзяў у ёй адбываюцца вельмі істотныя змены і зрухі, так што на некаторыя моманты, якія былі абсалютна апраўданыя ў пачатку 1990-х гадоў, цяпер можна паглядзець у пэўным сэнсе крытычна.

Хачу яшчэ раз падкрэсліць таксама, што любая тэрміналогія, у тым ліку навуковая, у значнай ступені і вайсковая, — гэта тэрміналогія інтэрнацыянальная, яна не мае нацыянальных меж. Калі ласка, прыклад: «Крокам марш!». Слова «марш» — запазычанне з французскай мовы. А некаторыя барацьбіты за чысціню беларускай мовы чамусьці ўспрымаюць яго як русізм. А «марш» — гэткі ж русізм, як і беларусізм!

***— Чаму б не спыніцца, дапусцім, на варыянце «Крокам руш!»?***

— Што значыць — «руш»?

***— Вытворнае ад дзеяслова «рухацца».***

— Ну, гэта не зусім дакладна: трошкі іншая семантыка. «Рухацца» адпавядае рускаму «двигаться». А «марш» — гэта ісці страявым крокам. І гэта ўсім зразумела.

***— Дарэчы, а вы, Аляксандр Аляксандравіч, служылі ў войску?***

— Толькі на зборах. Дарэчы, у выпадках, калі складана было падабраць найбольш дакладныя адпаведнікі тым ці іншым выразам, мы звярталіся да ваенных, якія добра ведаюць беларускую мову.

***— Ці плануецца выдаць руска-беларускі слоўнік ваенных тэрмінаў?***

— Гэта было б лагічна: калі зыходзіць з прынцыпу дзяржаўнага двухмоўя — усе афіцыйныя дакументы павінны быць увасоблены ў дзвюх дзяржаўных мовах.

**Гутарыла Таццяна ПАДАЛЯК.**

# НА ЯКОЙ МОВЕ СПЯВАЕ БЕЛАРУСКАЯ АРМІЯ?

**У Мінску назвалі пераможцаў XIV тэлевізійнага фестывалю армейскай песні «Зорка».**



«Зорка» — адзіны ў Беларусі маштабны тэлевізійны штогадовы фестываль армейскай песні, заснаваны Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніяй і Міністэрствам культуры. Звычайна ўдзельнікі спаборнічаюць у чатырох намінацыях: «Выканаўцы песень прафесійных аўтараў», «Аўтары-выканаўцы», «Вакальныя гурты і ансамблі, калектывы масавага выканання», «Выканаўцы армейскай песні». Сёлета ўладальнікам Гран-пры ў намінацыі «аўтары-выканаўцы» ўпершыню стаў радавы салдат тэрміновай службы Аляксандр Панасюк з песняй «А ведаеце, людзі». Адметна, што з 19 песень-пераможцаў XIV фестывалю 10 напісаны армейскімі аўтарамі. Наогул, сёлета «Зорка» надзвычай багатая на новыя імёны. Можна на пальцах пералічыць канкурсантаў, якія ўдзельнічалі ў фестывалі не першы год.

Вельмі цешыць тое, што палова, калі не пераважная большасць, песень-пераможцаў — на беларускай мове. І гэта невыпадкова.

— У Палажэнні тэлевізійнага фестывалю армейскай песні, якое я распрацаваў чатыры гады таму, напісана, што выканаўца павінен прапанаваць на конкурс не больш за дзве песні, адна з якіх павінна абавязкова быць на беларускай мове. І калі ён прадстаўляе адну песню, то гэта беларускамоўная песня, — распавядае **Сяргей МАКЕЙ, старшы афіцэр галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Беларусі і аўтар-выканаўца са стажам.** — Мы заўсёды стараемся зрабіць так, каб у кожным канцэрце была прыкладна аднолькавая колькасць беларускамоўных і рускамоўных выступаў. Чаму? Таму што ў нашай краіне двухмоўе, і мы стараемся нікога не пакрыўдзіць. Дарэчы, мая песня на беларускай мове «Афіцэры» таксама перамагла сёлета.

Фестываль удасканальваецца і змяняецца з кожным годам. Асабліва гэта заўважна мне, бо ў самым першым фестывалі я ўдзельнічаў як канкурсант. Змянілася і тое, пра што спяваюць хлопцы. Калі раней больш спявалі пра Вялікую Айчынную вайну, то сёння салдаты спяваюць пра сваю службу, сваю Радзіму, шмат цікавых аўтарскіх пунктаў гледжання выказваюць у песнях.

**Гвардыі маёр Віктар ДАНІЛЬЧЫК** тры разы перамагаў у фестывалі ў якасці аўтара-выканаўцы. Але сёлета атрымаў спецыяльны прыз журы «За раскрыццё беларускай тэматыкі ў патрыятычнай песні» разам са сваім вакальным гуртом «Альянс», які стварыў з жонак афіцэраў. Віктар Мікалаевіч піша песні пераважна на беларускай мове. Што яго, ваеннага чалавека, натхняе на гэта?

— Перш за ўсё мяне натхняе тое, што я нарадзіўся тут, у Беларусі. На хутары. Было вельмі смешна, калі я паступіў у ваенную вучэльню ў Новасібірск. І там хлопцы збіраліся і прасілі: «Ну, скажы, Данільчык, што-небудзь на беларускай мове!». Ім было вельмі цікава пачуць нашу гаворку. На жаль, зараз у нас мала хто размаўляе па-беларуску. Вось я і вырашыў больш песень пісаць на сваёй роднай мове.

**Дзмітрый БУХЦІЯРАЎ, камандзір 1-га аддзялення 554-га вучэбнага ўзвода факультэта проціпаветранай абароны Ваеннай акадэміі Беларусі**, які заканчвае пяты курс, перамог са сваёй беларускамоўнай песняй «Зямля вайны». Юнак прысвяціў яе сваім дзядулям і бабулям, якія ваявалі. Дзмітрый родам з Рэчыцы, дзе да вучобы ў ВНУ скончыў музычную школу па класе баяна і граў там у музычным ансамблі. Беларускую мову для сваёй песні хлопец выбраў не проста так.

— Шчыра кажучы, адрэдагаваць тэкст песні мне дапамаглі на кафедры беларускай мовы нашай акадэміі, бо беларускую граматыку я крыху падзабыўся, — прызнаецца Дзмітрый. — Я аднолькава прыязна стаўлюся і да рускай, і да беларускай моў. Але ўсё-ткі вельмі прыемна чуць, калі нехта размаўляе з табой па-беларуску. Мне вельмі падабаецца мілагучнасць, спеўнасць беларускай мовы. І менавіта беларускую мову я лічу роднай.

Гала-канцэрт лаўрэатаў XIV тэлевізійнага фестывалю армейскай песні «Зорка» па беларускім тэлебачанні можна будзе паглядзець 9 мая.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**



# ПРАМАЯ ЛІНІЯ

**31 сакавіка 2011 г.**
**Міністр абароны Рэспублікі Беларусь генерал-лейтэнант Юрый Віктаравіч ЖАДОБІН праводзіць «прамую тэлефонную лінію» з насельніцтвам. Задаць пытанне Міністру абароны можна з 14.00 да 15.00 па тэлефоне (8 017) 297 29 20.**



## Жанчыны ў арміі

### НА АФІЦЭРСКІХ ПАСАДАХ СЛУЖАЦЬ БОЛЬШ ЗА 400 ЖАНЧЫН

**Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны, у апошнія гады ва Узброеных Сілах назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя росту колькасці жанчын-вайскоўцаў. Калі ў 2005 годзе іх было менш за 4000, то ў 2010 годзе ўжо амаль 4500.**

Цяпер у беларускім войску больш за 400 афіцэраў-жанчын, звыш 1000 прапаршчыкаў і каля 3000 салдат і сяржантаў. Пераважная большасць афіцэраў-жанчын праходзяць службу на пасадах ваенных урачоў, псіхолагаў, перакладчыкаў, юрыстаў. Некаторыя ўзначальваюць аддзяленні ў ваенных камісарыятах. У ваенных навучальных установах вучацца 23 дзяўчыны, з іх 3 — на ваенным факультэце ў БДУ, 20 — у Ваеннай акадэміі (12 — на факультэце сувязі і АСУ, 8 — на авіяцыйным факультэце). Прычым на авіяцыйным факультэце 3 дзяўчыны-курсанты асвойваюць лётныя спецыяльнасці, а астатнія — інжынерныя.

**Андрэй ПЯТРОЎ,** *«Мінск—Навіны».*

# ЛЭДЗІ-АФІЦЭР

**Спрэчкі пра ролю і прызначэнне жанчыны не спыняюцца ніколі. Дэбаты адносна фемінізацыі арміі ў апошнія гады ўсё часцей і часцей займаюць тэле- і радыёэфір.**

Чамусьці ні ў кога не ўзнікае пытання, чаму мужчыны танцуюць стрыптыз або працуюць афіцыянтамі, а вось тэма «Жанчына ў арміі» даўно ўжо стала пагалоскай і з'яўляецца лішняй падставай для моцнага полу ў чарговы раз кінуць камень у агарод чароўных амазонак. Прычым заўзятыя прыхільнікі патрыярхату з задавальненнем падаюць гэтыя самыя камяні сваім мужам, у той час як заўзятыя феміністкі цвёрда адстойваюць сваю пазіцыю аб раўнапраўі і свабодзе выбару. А пакуль тыя і другія спрабуюць схіліць багіню справядлівасці Дзіке на свой бок, трэція спакойна, не спяшаючыся і сумленна, выконваюць свае службовыя абавязкі, прасоўваючыся ўверх па кар'ернай лесвіцы.

Сярод наведнікаў форуму афіцыйнага сайта Міністэрства абароны (forummod.bn.by) «Жанчына ў арміі» таксама сустракаецца нямала зласліўцаў, якія прагнуць ачарніць лэдзі ў пагонах. Так, напрыклад, «актывіст» пад нікам «Сталін» сцвярджае: «Жанчына ў арміі — гэта адзін з самых бескарысных прадметаў, большасць з іх нічога не робіць і пры гэтым зарабляе грошы, акрамя гэтага ва ўсіх, за рэдкім выключэннем, ёсць дах у выглядзе таты-палкоўніка!».

Няхай будзе так, прапусцім міма вушэй параўнанне жанчын з бескарыснымі прадметамі. Але што датычыцца «нічога не робіць і пры гэтым зарабляе грошы», тут, калі ласка, больш падрабязна.

Вы хочаце сказаць, што ў арміі ўводзяцца спецыяльныя пасады «марнавання часу» менавіта для жанчын? А чым, па-вашаму, адрозніваюцца службовыя абавязкі сувязістаў, фінансістаў, кладаўшчыкоў, начальнікаў складоў мужчын і жанчын? Ці вы лічыце, што калі б на гэтых пасадах знаходзіўся «самазадаволены пол, які лічыцца моцным», то яму давялося б выконваць іншыя абавязкі?

Развесяліла выказванне і нейкага «sergodanilov»: «...Жанчынам нельга ў армію, не жаночая гэта справа, таксама як пячы бліны лепш не мужчынам. Ды і ўявіце, колькі часу будзе збірацца жанчына да пастраення, пакуль намалюецца, напудрыцца?». На гэты выпад хацелася б адказаць наступнае. Жанчына, на шчасце, на пастраенне можа прыйсці і без «грыму», а вось мужчыну стаць у строй «аброслым і калючым» недапушчальна. Так што ў гэтым выпадку яшчэ можна паспрачацца, каму патрабуецца на зборы больш часу.



Гвардыі капітан Надзея СОЛЬЦЫНА.

А вось яшчэ адзін ненавіснік жанчын у пагонах і заўзяты прыхільнік патрыярхату — Barmalei. «А дзяцей хто будзе нараджаць і выхоўваць???? У гэтым самым XXI стагоддзі. Маці ваеннаслужачая, якая матаецца па дзяжурствах, вучэннях і іншых цяжкасцях і нягодах вайсковых????». Паважаны спадар, а маці-ўрач, якая дзяжурыць па начах у бальніцах, маці-педагог, якая прысвячае выхадныя дні чужым дзецям, маці-будаўнік, якая будуе ў дваццаціградусны мароз вам дах над галавой, вас не здзіўляюць? Дык чым жа іх праца адрозніваецца ад службы жанчын-ваеннаслужачых?

Неяк дзіўна атрымліваецца, дарагія мужчыны. З аднаго боку, вы крычыце, што жанчыны ідуць у войска, каб «нічога не рабіць і грошы атрымліваць», а з другога, сцвярджаеце, што ваенная служба — гэта цяжкая праца, якая слабаму полу не пад сілу. Вызначыцеся і прызнайцеся самі сабе: жанчыны перасягаюць мужчын у выкананні скрупулёзнай, руціннай працы, што патрабуе большай цярплівасці, уседлівасці. І ўжо дакладна ніхто не стане спрачацца, што ў войску шмат пасад, на якіх жанчына-ваеннаслужачая прыносіць значна больш карысці, чым мужчына — па прычыне сваёй цярпімасці, стараннасці, карпатлівасці. Прычым часта не толькі не саступаючы моцнаму полу, але і апераджаючы яго.

*(Заканчэнне на 6-й стар.)*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## GREENPEACE ПРЫРАЎНАВАЎ АТАМНУЮ КАТАСТРОФУ Ў ЯПОНІІ ДА ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ

Greenpeace прызнаў атамную катастрофу ў Японіі такой жа небяспечнай, як і чарнобыльская, хоць эксперты доўгі час сцвярджалі, што сітуацыя на аварыйнай «Фукусіме-1» менш крытычная. Аднак зараз Greenpeace заявіў пра прысваенне аварыі на японскай АЭС 7 балаў па шкале INES, як і чарнобыльскай катастрофе, піша французская L'Express са спасылкай на заяву прадстаўніка кампаніі ТЕРСО.

## ДА 2050 ГОДА АМАЛЬ МІЛЬЯРДУ ЧАЛАВЕК НЕ ХОПІЦЬ ВАДЫ



**Пры захаванні цяперашніх тэмпаў урбанізацыі і ўплыве глабальнага пацяплення на прэснаводныя сістэмы планеты да 2050 года амаль 1 млрд гарадскіх жыхароў сутыкнецца з глабальным недахопам вады.**

Паводле даследаванняў амерыканскай арганізацыі Nature Conservancy, да сярэдзіны гэтага стагоддзя каля 993 млн гараджан па ўсім свеце будуць жыць на 100 л вады ў дзень. Гэта аб'ём адной сярэдняй ванны і мінімальная колькасць, неабходная, на думку даследчыкаў, аднаму чалавеку ў дзень на ежу, гігіену і розныя тэхнічныя патрэбы.

Па прагнозе экспертаў, найгоршая сітуацыя будзе ў буйных гарадах, размешчаных у трапічным поясе. У гэтым выпадку пад удар трапляюць такія краіны, як Індыя, а таксама Блізкі Усход, краіны Лацінскай Амерыкі. На сённяшні дзень каля 150 млн чалавек жыве на 100 л вады ў дзень. У той час сярэдні жыхар Еўропы і ЗША спажывае 376 л вады ў суткі.

## У ГРЭЦЫІ БАСТУЮЦЬ УРАЧЫ




**У Грэцыі ўсеагульны двухдзённы страйк пачалі ўрачы Дзяржаўнага страхавога фонду. Бастуючыя медработнікі выступаюць за падаўжэнне кантрактаў усім медыкам Дзяржфонду, патрабуюць паляпшэння ўмоў працы і змагаюцца за павышэнне ўзроўню медыцыны ў краіне, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Да акцыі пратэсту далучыліся саюзы медыкаў Афін і Пірэя, а таксама Федэрацыя ўрачоў бальніц, якая выступае супраць скарачэння працоўных месцаў і аб'яднання бальніц. Федэрацыя таксама дабіваецца годных для ўсіх работнікаў зарплат і захавання бясплатнага лячэння ў дзяржаўных медустановах.

## СВЕЖЫ РЭЙТЫНГ МІЛЬЯРДЭРАЎ РАСІІ ЎЗНАЧАЛІЎ ЛІСІН

**Уладальнік Навалiпецкага металургічнага камбіната Уладзімір Лісін другі год запар прызнаны самым багатым расіянінам па версіі часопіса «РБК», з багаццем у 23,3 млрд долараў.**

У пяцёрцы лідараў таксама апынуліся ўладальнік «Металаінвеста» Алішэр Усманаў, кіраўнік групы «Анэксім» Міхаіл Прохараў, заснавальнік АФК «Сістэма» Уладзімір Еўтушэнкаў і кіраўнік «Поўначсталі» Аляксей Мардашоў.

# «Годовой отчет эмитента ценных бумаг»

**Открытое акционерное общество «Швейная фабрика «Дината»**
**222310, г.Молодечно, ул. Ясинского, 36.**
**Тел. 8(0176) 76-07-47, тел./факс 74-67-88.**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
**на 01 января 2011 года, млн. руб.**

| Наименование показателя | Код стр. | На начало отчетного года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| **АКТИВ** | | | |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 1833 | 1931 |
| Нематериальные активы | 120 | 1 | 1 |
| Доходные вложения в материальные ценности | 130 | | |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 57 | 58 |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | | |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **1891** | **1990** |
